УДК 94(474/476)«1625/1629»+94(438)«1625/1626»+94(485)«1625/1629»

**А. В. Дземідовіч**
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

# ПАЛІТЫЧНАЯ АКТЫЎНАСЦЬ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА ПАДЧАС ВАЙНЫ ШВЕЦЫІ З РЭЧЧУ ПАСПАЛІТАЙ 1625–1629 ГГ.

Артыкул разглядае палітычную актыўнасць Вялікага Княства Літоўскага (ВКЛ) падчас вайны паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай 1625–1629 гг., якая з'явілася працягам барацьбы за дынастычную карону і панаванне на Балтыцы. На аснове крыніц ацэнены пазіцыя і дзеянні Княства адносна дадзенага канфлікту. У асноўным шляхта ВКЛ жадала закончыць вайну шляхам мірнага пагаднення. Самастойнае падпісанне перамір'яў прадстаўнікамі ВКЛ у адзначаны перыяд можна патлумачыць цяжкім становішчам дзяржавы падчас вайны: недахопам грашовых сродкаў, ваеннымі паразамі, агульнай стомленасцю. Падобныя крокі ВКЛ выклікалі негатыўную рэакцыю манарха і прадстаўнікоў Каралеўства Польскага, якія сцвярджалі, што такія дзеянні супярэчаць Люблінскай уніі 1569 г. Гэтыя супярэчнасці сведчылі пра тое, што ВКЛ у знешняй палітыцы кіравалася рэальнай сітуацыяй, а не ўнійнымі імператывамі.

**Ключавыя словы:** Рэч Паспалітая, Вялікае Княства Літоўскае, Каралеўства Польскае, Швецыя, шляхта, вайна.

**A. V. Dzemidovich**
Belarusian State University

# THE POLITICAL ACTIVITY OF THE GRAND DUCHY OF LITHUANIA DURING THE WAR BETWEEN SWEDEN AND POLISH-LITHUANIAN COMMONWEALTH IN 1625–1629

The article considers the political activity of the Grand Duchy of Lithuania during the war between Sweden and Polish-Lithuanian Commonwealth in 1625–1629. It was a continuation of dynastic struggle for the crown and the domination of the Baltic Sea. The article reveals on the basis of the sources the position and actions of the Duchy to this conflict. Generally the gentry of the Duchy wanted to finish the war by a peace agreement. Separate signing of the truces by representatives of the Grand Duchy of Lithuania can be explained by the difficult situation of the state in the war: lack of money, military defeats, general fatigue. Such actions of the Duchy caused a negative reaction of the monarch and the nobility of the Kingdom of Poland. They argued that such actions are contrary to the Union of Lublin in 1569. These contradictions showed that the foreign poliy of the Duchy was guided by the actual situation, but not imperatives of the Union.

**Key words:** The Polish-Lithuanian Commonwealth, the Grand Duchy of Lithuania, the Kingdom of Poland, Sweden, gentry, war.

**Уводзіны.** Вайна 1625–1629 гг. паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай з'явілася працягам канфлікту, які разгарнуўся паміж імі ў пачатку XVII ст. У другім дзесяцігоддзі XVII ст. у барацьбе са Швецыяй Рэч Паспалітая выглядала знясіленай, што было абумоўлена дэфіцытам дзяржаўнага скарбу, ваеннымі і дыпламатычнымі паражэннямі (асабліва моцна пазіцыі дзяржавы падарваў захоп шведамі Рыгі ў 1621 г.). Тым не менш Жыгімонт III Ваза не збіраўся адмаўляцца ад змагання, ігнаруючы пры гэтым настрой шляхты ВКЛ, якое па вядомых прычынах не магло не быць заангажаваным у канфлікт, які на той момант ужо выйшаў за рамкі ўласна дынастычнай барацьбы. Больш таго, менавіта ў гэты перыяд надзвычай праявілася палітычная актыўнасць Княства, якая выразілася ў спецыфічнай, адметнай пазіцыі (у параўнанні з пазіцыяй Каралеўства Польскага і манарха) адносна вайны са Швецыяй. Мэта артыкула – ахарактарызаваць палітычную актыўнасць ВКЛ у кантэксце вайны Швецыі з Рэччу Паспалітай 1625–1629 гг.

**Асноўная частка.** У чэрвені 1625 г. выходзіў тэрмін папярэдняга перамір'я паміж Рэччу Паспалітай і Шведскім Каралеўствам. Усведамляючы мажлівы працяг канфлікту, дзяржавы-суперніцы рыхтаваліся да яго. Праўда, вынік падрыхтоўкі быў розны: Швецыя здолела сабраць грошы і рэсурсы, правесці рэарганізацыю арміі і флота, удасканаліць зброю і ваеннае майстэрства. У Рэчы Паспалітай падрыхтоўку да вайны можна ахарактарызаваць хутчэй як «тэарэтычную»: пытанне абмяркоўвалася на шляхецкіх форумах, шмат намаганняў ішло на тое, каб выпрацаваць адзінае бачанне знешнепалітычнага курсу паміж цэнтральнай уладай і Каралеўствам Польскім з аднаго боку і ВКЛ з другога.

Летам 1625 г. пачынаецца адкрытая фаза чарговага супрацьстаяння паміж дзяржавамі, на чале якіх стаялі прадстаўнікі розных галін дынастыі Вазаў – Жыгімонт III і Густаў II Адольф.

Поспехі Швецыі (былі захоплены Біржы, Баўска, Мітава на працягу верасня – кастрычніка 1625 г.) заклапоцілі Рэч Паспалітую і асабліва ВКЛ. Соймікі ВКЛ, якія сабраліся перад соймам 1626 г., актыўна абмяркоўвалі дадзеную праблему. Вядома шэраг інструкцый гэтай перадсоймавай кампаніі. У якасці прыкладаў, па якіх можна меркаваць аб пазіцыі ВКЛ, прывядзем наступныя. Ашмянская шляхта адразу ж звярнула ўвагу на тую шкоду, якую прынесла ВКЛ парушэнне перамір'я [1, арк. 1]. Было заўважана, што прадстаўнікоў Каралеўства Польскага гэта таксама павінна хваляваць, так як яны трымаюць альтэрнату, а значыць павінны дапамагчы грашовымі сродкамі. У цэлым інструкцыя прадпісвала раіцца аб абароне і вяртанні Інфлянтаў са станамі каронннымі [1, арк. 1, 3]. Шляхта Упіцкага павета адносна вайны, узноўленай па віне Швецыі, выказалася ў дастаткова рэзкім тоне. Так, павятовая шляхта выступіла з жаданнем не толькі выцесніць непрыяцеля з Інфлянтаў і Курляндыі, але таксама перанесці наступальныя дзеянні на тэрыторыю Швецыі. Апошняе, верагодна, было абумоўлена тым, што Упіцкі павет непасрэдна межаваў з Інфлянтамі. У інструкцыі зафіксаваны скаргі на тое, што пра вераломны ўчынак шведаў (аднаўленне ваенных дзеянняў – *А. Д.*) мясцовыя жыхары даведаліся не толькі праз каралеўскага пасла, але і са свайго ўласнага досведу, бо спазналі спусташэнні і разбурэнні [2, арк. 2].

Больш памяркоўным, і можна сказаць, нават пасіўным настроем прасякнута віленская інструкцыя [3, арк. 2]. Яна наказвала абмеркаваць меры супраць непрыяцеля з іншымі пасламі з ВКЛ і Каралеўства Польскага. Дазваляла сваім паслам ухваліць на абарону некалькі пабораў. Гэтая інструкцыя зафіксавала рэдкі выпадак у дадзенай перадсоймавай кампаніі (акрамя яшчэ інструкцыі Аршанскага павета), калі выказвалася надзея на заключэнне міру з непрыяцелем [3, арк. 1; 4, s. 30]. Аршанскі павет загадаў сваім паслам у першую чаргу дамаўляцца аб дапамозе з кароннымі пасламі, маючы на ўвазе небяспеку, якая пагражае ВКЛ ад Густава II Адольфа: «Каб нам у гэтым выпадку, паколькі да зямлі Інфлянцкай аднолькавыя маем інтарэсы, таварышылі і аднолькава з намі цяжары неслі, не менш» [5, арк. 1]. Інструкцыя вылучаецца пацыфісцкім характарам: у ёй не толькі адсутнічаюць агрэсіўныя намеры і ідэі, але і выказваецца гарачае жаданне, каб нават гэтая абарончая вайна найхутчэй была закончана мірам.

Своеасаблівым папрокам цэнтральнай уладзе з'явілася інструкцыя Мінскага ваяводства. Шляхта выказвала незадавальненне тым, што дзеля абмеркавання пытання аб падатках штогод збіраюцца соймы. Узгадала таксама, што неаднаразова прасіла аб захаванні міру са Швецыяй, аднак супрацьстаянне з ёю працягвалася. Падкрэслівалася, што дакладна вядома, што гэта вайна «магла бы быць на некалькі гадоў перамір'ем спынена. Але асабліва шкада, што па прычыне затрымання ратунку, непрыяцель вялікую шкоду ВКЛ і ў Курляндыі здзейсніў» [6, арк. 1]. Шляхта наказвала сваім паслам прасіць караля, каб той спыніў на час гэту вайну і падумаў аб мірных перамовах [6, арк. 1–2].

Троцкае ваяводства даручала паслам дамаўляцца па надзённых праблемах з усімі станамі Рэчы Паспалітай, падкрэсліваючы пры гэтым, што неабходна разглядаць справы так, каб «непрыяцелю не толькі адпор даць, але каб захопленыя замкі вернуты быць маглі» [7, арк. 2]. Зноў жа было ўзгадана, што палякі адпаведна ўніі і «Канстытуцыі аб зямлі Інфлянцкай» павінны дапамагчы грашыма ў абароне гэтай тэрыторыі [7, арк. 2].

У хуткім часе ваенныя дзеянні Густава Адольфа былі распаўсюджаны на тэрыторыю Прусіі. У такіх умовах Жыгімонт III накіроўвае гетману Льву Сапегу ў ліпені 1626 г. загад аб тым, каб падпарадкаваныя яму войскі ВКЛ былі накіраваны да Прусіі. У выніку ў Інфлянтах заставалася 4 тысячы войска, а астатняе павінна было рушыць да Торуня [8, s. 14]. Поспехі шведаў у Прусіі прымусілі вялікага гетмана ВКЛ Льва Сапегу накіраваць ліст, датаваны 20 ліпеня 1626 г., да абывацеляў Жамойцкага Княства, у якім ён паведамляў, што «такое блізкае суседства» ўяўляе значную пагрозу, і папярэджваў аб неабходнасці быць падрыхтаванымі на выпадак раптоўнага напада ворага і спадзявацца ў гэтым пакуль што толькі на саміх сябе [9, nr 47, s. 195–196].

Рэч Паспалітая ў цэлым, і ВКЛ у прыватнасці, на той момант знаходзіліся ў цяжкім становішчы, абумоўленым шэрагам прычын: недахопам грашовых сродкаў; непаразуменнем паміж вялікім гетманам і гетманам польным ВКЛ – Сапегам і Радзівілам адпаведна, што прывяло да паражэння пад Вальгафам у студзені 1626 г.

Крытычнае становішча ВКЛ падчас доўгатэрміновага канфлікту са Швецыяй прывяло да таго, што па ўласнай ініцыятыве прадстаўнікі Княства заключалі са шведскім бокам пагадненні (жнівень 1622 г.; сакавік 1626 г.; студзень 1627 г.). Усім гэтым пагадненням была ўласціва наступная рыса: заключаліся яны без узгаднення манарха, што выклікала адпаведную рэакцыю ў Жыгімонта III Вазы, з якім салідарызавалася вышэйшае саслоўе Каралеўства Польскага.

Асабліва характэрным у гэтым плане з'яўляецца студзеньскае перамір'е 1627 г. у Балдэнмойжа, заключанае прадстаўнікамі ВКЛ і Швецыі. 19 студзеня 1627 г. на Інфлянцкім памежжы ў Балдэнмойжа дэлегаты, прызначаныя Львом Сапегай, заключылі дамову ад імя вялікага гетмана ВКЛ са шведскім бокам, прадстаўленым Якубам Дэлагардзі і Густавам Горнам. Сярод умоў было – зразумела, часовае спыненне ваенных дзеянняў, абмен палоннымі, свабодны гандаль. Рашэнне аб заключэнні гэтага перамір'я прымала вузкае кола магнатаў ВКЛ. Вядома, што ў абмеркаванні прынялі ўдзел гетман ВКЛ Леў Сапега, віленскі біскуп Астафій Валовіч, мсціслаўскі ваявода Мікалай Кішка, троцкі ваявода Ян Скумін Тышкевіч, падскарбі ВКЛ Крыштоф Нарушэвіч [10, s. 29; 11, s. 271]. З улікам складаных абставін вайны са Швецыяй і сфарміравалася ідэя заключэння вышэйзгаданага перамір'я. Сярод цяжкасцей, якія ўскладняюць яе правядзенне, прадстаўнікі ВКЛ узгадвалі і фінансавыя: патрэба ў сродках, што вылівалася ў невыносны цяжар падаткаў.

Перамір'е 1627 г. (павінна было дзейнічаць да 11 чэрвеня 1627 г.) выклікала хвалю абурэння і гневу манарха і шляхты кароннай, якія ўгледзелі ў гэтым падрыў аўтарытэта каралеўскай улады і дэзінтэграцыйныя тэндэнцыі, якія пагражалі будучыні Рэчы Паспалітай.

Вядомы ліст кракаўскага біскупа Марціна Шышкоўскага ад 24 лютага 1627 г., у якім ён выказаўся наконт гэтага перамір'я, прычым зрабіў гэта ў дастаткова лаяльнай форме. Паказваючы разуменне цяжкай сітуацыі, якая прымусіла заключыць дагавор, біскуп, аднак, выказаў меркаванне, што ВКЛ не варта было спадзявацца і разлічваць на дапамогу ўсёй Рэчы Паспалітай, а клапаціцца аб сваёй бяспецы самому, як гэта робіць Каралеўства Польскае. Да таго ж, выказвалася асцярога, што гэты ўчынак можа паслужыць дрэнным прыкладам [12, арк. 1].

Шляхта ВКЛ вымушана была тлумачыць матывы сваіх дзеянняў. Шэраг уплывовых асоб Каралеўства Польскага атрымалі лісты, у якіх апавядалася аб прычынах заключэння перамір'я са шведамі. Безумоўна, гэта былі ваенныя поспехі непрыяцеля і няздольнасць аказаць яму належнае супраціўленне, крытычны стан войска Рэчы Паспалітай, а таксама чуткі, што шведы плануюць працягнуць наступленне ўглыб тэрыторыі ВКЛ. Таксама гаворка ішла пра недахоп сродкаў на вайну, асабліва пра цяжкі матэрыяльны стан ВКЛ, пры гэтым падкрэслівалася, што Княства не мае дапамогі на працягу немалога часу з Кароны. Утрымлівалася просьба і аб тым, каб магнаты Каралеўства Польскага дапамаглі ім паўплываць на Жыгімонта III, каб ён не абражаўся «гэтым заключэннем такога патрэбнага і карыснага перамір'я», бо ўчынак гэты здзейснены «з дабром і выгадай» для Рэчы Паспалітай [13, k. 203].

Нягледзячы на спецыфічную палеміку, якую выклікала такая дыпламатычная акцыя ВКЛ, Княства і далей працягвала здзяйсняць падобныя крокі. Сведчаннем гэтага з'явілася спатканне ўпаўнаважаных пад Баўскай, дзе 28 мая 1628 г. абмяркоўвалася пытанне абмену палоннымі, а таксама новае перамір'е тэрмінам ад 3 красавіка да 15 чэрвеня (потым працягнутае да 1 верасня) 1629 г. [14, s. 50–51].

Падзеі, звязаныя з вайной са Швецыяй, апынуліся ў цэнтры ўвагі передсоймавых соймікаў 1627 г. Шляхта ВКЛ узняла для абмеркавання наступныя пытанні: магчымасць заканчэння вайны мірным шляхам [15, s. 29] і апраўданне «аўтараў» перамір'я 1627 г. [16, арк. 1].

На 9 студзеня 1629 г. быў скліканы ў Варшаве сойм, каб абмеркаваць, у тым ліку, і працяг вайны. Вядомыя пасольскія інструкцыі з соймікаў ВКЛ (наваградскага, ашмянскага, упіцкага) зноў закранулі праблемы, звязаныя з канфліктам Рэчы Паспалітай са Швецыяй. Папершае, відавочны непакой адносна закрыцця партоў, якое пацягнула за сабою матэрыяльныя страты, як вынік – гучаў наказ паслам дамагацца іх адкрыцця і аднаўлення гандлю праз Нёман і Вілію. Па-другое, шляхта ВКЛ дамагалася перадачы ў скарб Княства сумы ў 100 тысяч злотых, выдаткаваных Каралеўствам Польскім у якасці кампенсацыі за закрыццё партоў. Патрэцяе, выказвалася незадаволенасць, што жаўнеры ў Інфлянтах не атрымалі належнай зарплаты за службу, у сувязі з чым ВКЛ выказала жаданне мець кантроль над грашовымі сродкамі, прызначанымі на гэтыя мэты [17, s. 29].

У 1628–1629 гг. становішча ВКЛ было цяжкім. Выразна ахарактарызавалі стан спраў лісты сенатараў ВКЛ да манарха і каронных сенатараў. У лісце-звароце да караля, датаваным 8 ліпеня 1629 г., уплывовыя асобы ВКЛ, сярод якіх былі Астафій Валовіч і Леў Сапега, апісалі тыя нязгоды, якія мусіла цярпець ВКЛ. Першапачаткова гаворка ішла пра голад і неўраджаі, наступствам якіх былі альбо адыход людзей з межаў Княства ў пошуках сродкаў для існавання, альбо смерць. Далей закраналася тэма знешняй небяспекі. Адрасанты звярталі ўвагу на тое, што вораг не толькі сам ваюе з імі, але таксама іншых непрыяцеляў пабуджае на іх, і асабліва – «маскоўскага». Ужо ў гэты час адчуваўся подых Смаленскай вайны: лісты ўтрымлівалі інфармацыю, што Расія збірае войска, жадаючы распачаць вайну і вярнуць сабе Смаленск разам з іншымі тэрыторыямі. Была выказана боязь за лёс ВКЛ, бо, як паведамлялася, непрыяцель, ведаючы аб слабасці войска і беднасці скарбу Рэ-

чы Паспалітай, па-ранейшаму пагражае ВКЛ [18, арк. 1]. Прадстаўнікі ВКЛ данеслі да ведама манарха, што Княства не мае неабходных сродкаў для працягу вайны, што слабая надзея атрымаць іх і ад пабораў. З улікам усяго вышэйпералічанага, з мэтай прадухіліць «блізкі заняпад айчыны», шляхта ВКЛ у лісце да Жыгімонта III выказала роспачную просьбу: знайсці сродак вырашыць гэтыя праблемы дзеля таго, каб ВКЛ засталося ў цэласнасці і не прыйшло да «шкоднай і ніколі неаплаканай згубы» [18, арк. 1]. Падобны зместам ліст быў напісаны крыху раней, 3 ліпеня 1629 г., да сенатараў Каралеўства Польскага [18, арк. 3–4].

Легітымным карэктаваннем аднаасобных знешнепалітычных дзеянняў ВКЛ, як часткі федэратыўнай дзяржавы, з’явілася заключэнне Альтмаркскага перамір’я ў верасні 1629 г. паміж Рэччу Паспалітай і Швецыяй, якое тым не менш не паставіла канчатковую кропку ў складаных адносінах гэтых дзяржаў. Канфлікт меў працяг, і ў сярэдзіне XVII – пачатку XVIII ст. Шведскае Каралеўства з’яўлялася тым суб’ектам, які ўяўляў сабой не толькі знешнепалітычную небяспеку для Рэчы Паспалітай, але спрычыніўся і да ўнутранага разладу гэтай дзяржавы.

**Заключэнне.** Як бачна, падчас вайны 1625–1629 г. ВКЛ дэманструе актыўную палітычную пазіцыю. Па-першае, шляхта ВКЛ выкрышталізавала ўласнае бачанне канфлікту Рэчы Паспалітай са Швецыяй: жадала ўрэгуляваць яго шляхам міру; імкнулася прыцягнуць Каралеўства Польскае да належнага фінансавання вайны. Па-другое, палітычная эліта Княства неаднаразова заключала сепаратныя (без узгаднення з партнёрам па федэрацыі і цэнральнай уладай) пагадненні з варагуючым бокам. Па-трэцяе, ВКЛ узняло і паставіла на павестку дня неабходнасць быць падрыхтаванымі да верагоднага ўзнаўлення вайны з боку Расіі. Некаторыя з вышэйадзначаных момантаў сведчылі пра тое, што сістэма функцыянавання Рэчы Паспалітай як адзінай дзяржавы прадэманстравала збой, чарговы (і не апошні) раз спатыкнуўшыся аб выклікі свайго часу.

## Літаратура

1. AGAD. AR. II. nr 940.
2. AGAD. AR. II. nr 942.
3. AGAD. AR. II. nr 935.
4. Kwak J. Sejm warszwawski 1626 r. Opole: Wyższa Szkoła Ped., 1985. 139 s.
5. AGAD. AR. II. nr 943.
6. AGAD. AR. II. nr 944.
7. AGAD. AR. II. nr 936.
8. Seredyka J. Sejm w Toruniu z 1626 roku. Wrocław: Zakł. Nar. im. Ossolińskich, 1970. 194 s.
9. Biblioteka Muzeum Narodowego im. Czartoryskich w Krakowie. Rkps. 118.
10. Wisner H. Spór o rozejm litewsko-szwedzki w Baldenmojzie z 1627 roku // Zapiski Hist. 2001. T. 66, z. 1. S. 23–36.
11. Wisner H. Rozejm w Baldenmojzie (1627) // Lietuva ir jos Kaimynai. Nuo normanų iki Napoleono: straipsniu rinkinys. Vilnius: Vilniaus univ., 2001. S. 266–277.
12. AGAD. AR. II. nr 975.
13. Biblioteka Jagiellońska w Krakowie. Rkps. 211.
14. Wisner H. Dyplomacja polska w latach 1572–1648 // Historia dyplomacji polskiej (połowa X–XX w): w 6 t.Warszawa: Państ. Wydaw. Nauk, 1982–1999. T. 2. S. 5–161.
15. Seredyka J. Sejm zawiedzionych nadziei. Opole: Wyższa Szkoła Ped. im. Powstanców śląskich w Opolu, 1981. 127 s.
16. AGAD. AR. II. nr 979.
17. Filipczak-Kocur A. Sejm zwyczajny z roku 1629. Warszawa; Wrocław: Państ. Wydaw. Nauk., 1979. 142 s.
18. AGAD. AR. II. nr 1023.

## References

1. Central Archives of Historical Records in Warsaw. AR. II. No. 940.
2. Central Archives of Historical Records in Warsaw. AR. II. No. 942.
3. Central Archives of Historical Records in Warsaw. AR. II. No. 935.
4. Kwak J. Sejm warszwawski 1626 r. [Warsaw Sejm 1626]. Opole, Wyższa Szkoła Ped. Publ., 1985. 139 p.
5. Central Archives of Historical Records in Warsaw. AR. II. No. 943.
6. Central Archives of Historical Records in Warsaw. AR. II. No. 944.
7. Central Archives of Historical Records in Warsaw. AR. II. No. 936.

8. Seredyka J. Sejm w Toruniu z 1626 roku [Sejm in Torun in 1626]. Wroclaw, Zakł. Nar. im. Ossolińskich Publ., 1970. 194 p.

9. The Library of the National Museum in Krakow. Manuscript 118.

10. Wisner H. Spór o rozejm litewsko-szwedzki w Baldenmojzie z 1627 roku. *Zapiski Hist* [Historical Records], 2001, vol. 66, z. 1, pp. 23–36.

11. Wisner H. Rozejm w Baldenmojzie (1627). *Lietuva ir jos Kaimynai. Nuo normanu iki Napoleono: straipsniu rinkinys* [Lithuania and its neighbors. From Norman to Napoleon: a collection of articles], Vilnius, Vilniaus univ., 2001, pp. 266–277.

12. Central Archives of Historical Records in Warsaw. AR. II. No. 975.

13. Jagiellonian Library in Krakow. Manuscript 211.

14. Wisner H. Dyplomacja polska w latach 1572–1648. *Historia dyplomacji polskiej (polowa X–XX w.)* [History of Polish diplomacy (half of the 10th – 20th centuries)], vol. 2. Warsaw, Państ. Wydaw. Nauk. Publ., 1982–1999, pp. 5–161.

15. Seredyka J. Sejm zawiedzionych nadziei [Sejm of the disappointed hopes]. Opole, Wyższa Szkoła Ped. im. Powstanców śląskich w Opolu Publ., 1981. 127 p.

16. Central Archives of Historical Records in Warsaw. AR. II. No. 979.

17. Filipczak-Kocur A. Sejm zwyczajny z roku 1629 [Ordinary sejm 1629]. Warsaw; Wroclaw, Państ. Wydaw. Nauk. Publ., 1979. 142 p.

18. Central Archives of Historical Records in Warsaw. AR. II. No. 1023.

## Інфармацыя пра аўтара

**Дземідовіч Алена Васільеўна** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў гістарычнага факультэта. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6, Рэспубліка Беларусь). E-mail: Helen1062@tut.by

## Information about the author

**Dzemidovich Alena Vasil'yevna** – PhD (History), Assistant Professor, the Department of Belarus History of the Ancient Time and the Middle Ages. Belarusian State University (6, Krasnoarmeyskaya str., 220030, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: Helen1062@tut.by

*Паступіў 17.02.2017*